Несмотря на трагедию и негативные коннотации война остается духовным ориентиром и коллективным опытом, в котором по-прежнему нуждаются современники. По мнению французского историка Николя Оффенштадта, это возвращение к прошлому, безусловно, означает, что у общества есть сомнения насчет своего будущего. Первая мировая война стала ресурсом, потому что память о ней сопровождается мистификацией социальной связи, которая в тот момент позволила обществу сохранить единство, несмотря на сложности и разногласия.

В Германии, где Первой мировой войне не отдавалось должное на протяжении десятилетий, где история государства «началась» в 1945 г., нынешнее напоминание жителям страны через выставки и музеи можно рассматривать как попытку вновь сделать войну и судьбы её участников частью своей истории, о чем свидетельствует успех запущенных проектов.


1. Denkmale in Brandenburg [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ns.gis-bldam-brandenburg.de/hida4web/view?docId=obj09140120.xml. – Дата доступа: 11.09.2018.
2. Europeana 1914–1918 – Unbekannte Geschichten und offizielle Dokumente zum Ersten Weltkrieg [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.europeana1914-1918.eu/de – Дата доступа: 11.09.2018.
3. Gesetz über die Erhaltung der Gräber der Opfer von Krieg und Gewaltherrschaft (Gräbergesetz) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.gesetze-im-internet.de/gr_bg/BJNR005890965.html – Дата доступа: 11.09.2018.
4. Fischer D. Der Ausbruch des Ersten Weltkrieges aus multiperspektivischer Sicht. Diplomica Verlag, 2014.


## АРТЭФАКТЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў ГІСТАРЫЧНЫМ МУЗЕІ СШ № 3 г. МЁРЫ

В.А. Ермалёнак

Сучасны Мёрскі раён знаходзіўся на адлегласці 90 кіламетраў ад лініі фронту Першай сусветнай вайны. Але не гледзячы на значную адлегласць за шматгадовую пошукавую дзейнасць мы знайшлі звыш 400 артэфактаў той вайны. Знойдзеныя экспанаты размешчаны як у пастаяннай экспазіцыі, так і ў навукова-дапаможных фондах музея. Пошуковую дзейнасць па збору артэфактаў Першай сусветнай вайны мы распачалі ў 70-я гады 20 стагоддзя, калі яшчэ заставаліся ў жывых яе ўдзельнікі. Намі былі запісаны на магнітафонную стужку ўспаміны: А. Пугачэўскага, Ф. Анашка, М. Кадушка, Ф.Лакотка і інш. Зараз “жывыя галасы вайны” перапісаны і захоўваюцца на камп’ютарных дысках. Асноўныя матэрыялы аб вайне 1914-1918 гадоў у гістарычным музеі нашай школы складаюць перш за ўсё арыгінальныя фотаздымкі і дакументы яе ўдзельнікаў. Найбольш цікавы з фотаздымкаў – вялікі фотапартрэт памерамі 40 на 50 см. маладога вайскоўца рускай арміі – Васіля Іванавіча Міклушонка з вёскі Прорвы. Ён закончыў Чэраскую царкоўна-прыхадскую школу, падчас Першай сусветнай вайны паспяхова завяршыў курс вучэбнай каманды ваенных фельдшараў у горадзе Сызрані 17 мая 1916 года. Аб гэтым сведчыць яго пасведчанне. Ваяваў Васіль амаль два гады на Румынскім фронце. Унікальны дакумент – ліст бацькам салдата аб смерці іх сына. Вось радкі з яго: “Уважаемые родители моего товарища Василия Миклушонка! С большим прискорбием спешу сообщить вам очень грустную и печальную весть для меня, но тем более для Вас, что уважаемый Вами Ваш сын Василий Иванович Миклушонок убит немецкой пулей под городом Одессой 5 марта по новому стилю сего 1918 года. Пуля попала ему сзади под левую лопатку и прошла через сердце навылёт. От упомянутой пули несчастный тут же скончался, не произнеся ни слова”. Далей аўтар ліста пытае, што рабіць з рэчамі



Репозиторий ВГУ

загінуўшага і просіць бацькоў мужна перанесці балючую вестку. Тэкст ліста абведзены ў знак жалобы чорнай фарбай [1, с. 5].

Шмат нашых землякоў адзначаны былі на франтах Першай сусветнай вайны высокімі ўзнагародамі. У музеі захоўваюцца звесткі аб М. Багдановічу з в. Воўкаўшчына і У. Карцяновічу з в. Пераброддзе, якія былі поўнымі георгіеўскімі кавалерамі – ўзнагароджаны георгіеўскімі крыжамі чатырох ступеняў**.** У экспазіцыі змешчаны здымак Аляхновіча Антона з в. Шалціны, які ўзнагароджаны двумя георгіеўскімі крыжамі. Ён мужна змагаўся ў 1915–1917 г.г. пад Пінскам. У 1919 годзе, калі бальшавікі забаранілі ў нашым краі званіць на Вялікдзень у званы, у Друі дзякуючы яму званы загучалі. Як апавядала яго дачка, бацька сустрэўся з камендантам Друі. Аказалася, што ён разам з ім ваяваў пад Пінскам і Аляхновіч ратаваў яго ад смерці. Таму ён і задаволіў просьбу франтавога сябра. Цікавы групавы здымак трох салдат, якія ўсе маюць узнагароду – георгіеўскі крыж. Вядомы толькі адзін з іх – Антон Сінкевіч з Пад’ельцаў. У 1939 годзе ён разам з Флорам Манцэвічам быў дэлегатам ад Заходняй Беларусі ў Маскву, дзе было вырашана пытанне аб уваходзе яе ў склад СССР. Але з нашай мясцовасці былі не толькі радавыя, але і прадстаўнікі малодшага і старэйшага афіцэрскага саставу. У музеі знаходзяцца звесткі і фотаздымкі аб Антону Шкелёнку. Ён нарадзіўся ў 1889 годзе ў в. Пякоціна. Скончыў Дзісенскае гарадское вучылішча, Віленскае пяхотнае вучылішча, два класы Мікалаеўскай ваеннай акадэміі, а пазней акадэмію Генеральнага штаба ў Санкт-Пецярбургу. З пачатку вайны служыў перакладчыкам у штабе Паўночна-Заходняга фронту. У1915 годзе ён ужо служыць пры штабе восьмай арміі, а пазней пераведзены на службу ў штаб Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёў. Падчас грамадзянскай вайны камандаваў пятай дывізіяй ў арміі Дзенікіна. Закончыў вайну ў войску Врангеля ў чыне палкоўніка. А ў Чэхаславакіі, куды ён трапіў у эміграцыю, яму было прысвоена званне генерала. У марскіх баях на Балтыйскім моры праславіліся марскія афіцэры з вёскі Якубава браты Раман і Мамерт Станкевічы. Апошні геройскі праявіў сябе ў знакамітым Маанзундскім марскім баі і быў прызначаны начальнікам штабу Балтыйскага флоту.

Рарытэтам музея з’яўляецца падрабязная карта 1914 года горада Турнэ і яго наваколляў. Гісторыя гэтага артэфакта звязана з лёсам нашага земляка Антона Андрэевіча Мальца, які нарадзіўся ў в. Якубаўшчына ў 1896 годзе. Рана застаўшыся без бацькі, Антон спачатку быў парабкам, а ў 16 год паехаў з хлопцамі ў Пецярбург. Прымаў удзел у забастоўках на Пуцілаўскім заводзе і дэманстрацыях. На ўсё жыццё застаўся праз усё плячо глыбокі шрам ад удару шашкі казака падчас разгону дэманстрацыі. У 1916 годзе быў прызваны ў дзеючую армію, трапіў на Паўночны фронт пад Рыгу. Са студзеня па чэрвень знаходзіўся ў акопах, быў кулямётчыкам. Падчас вясенняй паводкі акопы нечакана затапіла вадою, многія салдаты патанулі. Наш зямляк добра плаваў і некалькі раз, ныраючы ў ледзяную ваду, здолеў ратаваць свой кулямёт, бо зброі тады не хапала. За гэты ўчынак быў прадстаўлены да ўзнагароды, але атрымаць яе не паспеў. Праз некалькі дзён іх полк быў акружаны немцамі, частка салдат загінула, іншыя трапілі ў палон. Паміж апошніх быў і Антон Малец. У нямецкім палоне прабыў два гады. Даглядаў хворых коней і харчаваўся разам з жывёлай, галоўным чынам бульбай. На старым фотаздымку мы бачым нашага земляка разам з іншымі палоннымі на фоне надпісу на нямецкай мове “Конны лазарэт”. Раздабыўшы падрабязную карту Турына , патрапіў уцячы праз Бельгію ў Францыю, адкуль толькі ў 1924 годзе вярнуўся ў родную вёску. Жаніўся, працаваў на зямлі, потым кавалём ў калгасе, памёр у 1978 годзе. Важнай крыніцай інфармацыі аб нямецкім палоне з’яўляюцца здымак і ўспаміны, запісаныя Наталляй Грэцкай аб сваім прадзеду Грэцкім Фёдары Пракопавічу з в.Слаўшчызна [2, с.6].

У нашай экспазіцыі знаходзяцца два кішэнных гадзіннікі, якія часта ў гады вайны выконвалі ролю ўзнагароды салдатам і камандзірам. Так, адзін з іх падпісаны Віктару Акімавічу Шокелю з в. Цілеўцы, 1891 года нараджэння. Ён дзесяць месяцаў прабыў на



Рэпазіторый ВДУ

передавой. Мужна змагаўся у 1914 годзе на ўмацаваным рубяжы ля г. Млава ў Польшчы. Многія яго сябры загінулі, а ён быў цяжка паранены і ў шпіталі яго ўзнагародзілі імянным гадзіннікам за праяўленую на фронце адвагу. Яшчэ адзін імянны гадзіннік быў ўзнагародай падпрапаршчыку 1-й роты 110 палку Храброву за выдатную стральбу ў 1914 годзе.

Цікавыя дакументы свайго бацькі перадаў у музей у 2008 годзе Ян Лучыновіч. Яго бацька Іосіф Іванавіч з в. Масеўцы на фронце быў санітарам. Захавалася пасведчанне аб заканчэнні ім вучэбных курсаў. Ваяваў на Заходнім фронце разам з іншымі сваімі землякамі. Аб гэтым сведчаць і вайсковыя здымкі разам з землякамі Іванам Лясовічам, які потым стаў актыўным удзельнікам усталявання савецкай улады на Мёршчыне; з Каптурам Іванам з в. Чэрасы; з Шаўчонкам Юзэфам і Скавародкам Сяргеем з в.Масеўцы, з Костկам Гілярыям, які пазней у 1917 годзе загінуў на фронце. У нашых фондах захаваўся цікавы артэфакт: друкаваны ліст з фронту – віншаванне з нараджэннем Хрыстовым і Новым Годам з партрэтам царскай сям'і, якая быццам бы далучаецца да віншавання воіна расійскай імператарскай арміі. Такія лісты былі прызначаны, перш за ўсё, для непісьменных салдат. Вось якія просьбы былі ў гэтым лісце: па-першае – маліцца родным за тое, каб Гасподзь бараніў ад нямецкай кулі і штыка, а другая просьба да Госпада Бога – не сумаваць па мне, што нам выпаў такі лёс, пастаяць за Веру, Цара і Айчыну. Пад такім лістом дастаткова было паставіць свой подпіс, што і зрабіў Іосіф Лучыновіч, але, так як ён быў пісьменны, то на адваротным баку напісаў родным кароткі ліст. Акрамя Іосіфа ў войску быў і яго брат Міхаіл. Захаваўся пропуск бацьку, які быў выдадзены камандуючым другой роты Сібірскага запаснога палка 21 сакавіка 1917 года аб тым, што бацька наведаў свайго сына Міхаіла ў Дзеючай арміі. Праз некалькі месяцаў яго сын загінуў [3, с. 4].

У музеі захоўваюцца здымак і ўзнагароды Міхаіла Ермалёнка, удзельніка руска-японскай вайны. Яго старэйшы сын – выпускнік Дзвінскай гімназіі – добраахвотнікам пайшоў на фронт у 1915 годзе і хутка прапаў без вестак. Бацькі пісалі ў розныя ўстановы, але адказу не атрымалі. Тады бацька папрасіўся сам на фронт, пад Дзвінск, дзе прапаў яго сын, так як па ўзросту ён не мог служыць у войску, то быў залічаны ў вядомы партызанскі атрад Пуніна. Ваяваў поруч з Булак-Балаховічам. Яго мужнасць была адзначана срэбраным медалём "За храбрасць" і георгіеўскім крыжам 3–яй ступені. Выпадкова на фронце даведаўся аб тым, што яго сын быў паранены і памёр ад тыфу, пахаваны ў Дзвінскай крэпасці ў агульнай магіле. Таму, летам 1917 года, прыхапіўшы зброю, вярнуўся дахаты. Акрамя яго здымка і ўзнагародаў у экспазіцыі ёсць стальная каска Андрыянава, якая была ў французскіх салдат, а ў рускіх, толькі ў найбольш заслужаных, паміж якімі быў і Міхал Ермалёнак.

У раздзеле "Нашы землякі ўдзельнікі першай сусветнай вайны вайны" змешчана цэлая галерэя фотаздымкаў нашых землякоў паміж імі: Васіль Воронька з в. Грэцкія, Пётр Грэцкі з Якубаўшчыны, Іван Карман і Каравай Васіль з в. Вянужжа, Кяпсня Антон з Дзедзіна, Паўлоўскі Антон з Перабродзя, Піпін Антон в. Марцінаўцы, Фёдар Сцепулёнак. Пра апошняга у нашых фондах знаходзяцца ўспаміны, запісаныя яго ўнукам Іванам Сцепулёнкам у 1964 годзе. З іх мы даведваемся, што яго дзед, Фёдар Андрэевіч Сцепулёнак, нарадзіўся ў 1894 годзе ў вёсцы Падгайцы. З пачаткам Першай сусветнай вайны адразу быў прызваны ў царскае войска. Пасля кароткага навучання накіраваны на паўднёвы фронт, дзе ваяваў з аўстрыйцамі. Спачатку быў дзеншчыком пры афіцэры, а потым стаў унтэр-афіцэрам. Падчас аднаго з баёў быў паранены ў галаву, куля прайшла па чэрапе, але не прабіла, а толькі аглушыла. Пазней быў накіраваны на Паўночны фронт. І, неўзабаве, ізноў быў паранены. На гэты раз, падчас артылерыйскага абстрэлу, шрапнэльны шарык трапіў у рэчмяшок, дзе была металічная біклажка, якая выратавала салдату жыццё. Шрапнель не прабіла цела салдата, а засталася ў спіне. Таму, пасля шпіталя ізноў на фронт, і зноў выпрабаванне, на гэты раз атрутнымі газамі. І на гэты раз Фёдару пашчасціла. Да яго акопа газы не дайшлі, змяніўся вецер. Але ў суседніх акопах



Репозиторий ВГУ

усе салдаты загінулі, таму што процівагазаў яшчэ не было. Але салдат запомніў на ўсё жыццё, што атрутныя рэчывы пахлі цукеркамі. Трупаў было шмат, што некалькі дзён не змаглі іх пахаваць і ад гарачыні пачаўся страшны смурод. На гэтым выпрабаванні не скончыліся. Пачалася халера. Спачатку салдаты не ведалі, чаму так страшна рэжа ў брусе, толькі калі сталі паміраць, здагадаліся даставіць нейкую вакцыну, ад якой людзі рвалі на сабе валасы, амаль што вар'яцелі, лезлі на дрэвы, але выжылі. Напрыканцы 1917 года пачаўся голад і ў нямецкім войску. Прыходзілі галодныя нямецкія салдаты і прасілі кавалак хлеба, які выменьвалі на боты, гадзіннікі ці яшчэ на якія-небудзь рэчы. Пасля заканчэння вайны Фёдар Андрэевіч Сцепулёнак паехаў да свайго сябра салдата ў Петраград. Калі папрасіў што-небудзь паесці, той адчыніў скрынку камода, поўнага грошаў і сказаў: "Вось наша ежа". Вярнуўшыся на радзіму, пры Польшчы займаўся сельскай гаспадаркай, пасля вайны быў старшынёй калгаса. Але і праз шмат гадоў памяць аб вайне і загінуўшых сябрах не згасала ў памяці" [4, с. 8].

На жаль, большасць фотаздымкаў салдат нашых землякоў салдат Рускай імператарскай арміі, сабраных у фондах нашага музея – безымянныя, яны без подпісаў, той, хто перадаваў іх у наш музей, ужо не ведалі, хто змешчаны на здымку. З дакументаў экспазіцыі можна адзначыць ліст аб раненні Ісака Лебушава, выдадзены Ўсерасійскім Земскім Саюзам дапамогі хворым і раненым. З яго мы даведваемся, што яфрэйтар 159 Гурыйскага палка, 13 роты, 25-гадовы Ісак Лебушаў быў паранены ў баях пад Астраленкай куляй у плячо 23 ліпеня 1915 года, 27--дастаўлены ў Аршанскі шпіталь і не гледзячы на цяжкасць раны, ужо 17 жніўня быў выпісаны. За мужнасць і храбрасць у баях Ісак Лебушаў быў ўзнагароджаны двумя георгіеўскімі крыжамі. Падчас адной з разведак ён захапіў у палон нямецкага афіцэра.

У музеі захоўваецца і значная колькасць паштовак, прысвечаных падзеям вайны. Некалькі з іх раней былі змешчаны ў альбоме салдата чыгуначных войскаў расійскай імператарскай арміі Міхаіла Байдоўскага. На ім мы бачым відарысы розных ракурсаў чыгуначнага моста праз раку Заходні Буг. Мы ведаем, што гэта чыгунка адносілася да лініі Палескіх чыгунак. Яна праходзіла праз забалочаныя месцы з вялікай колькасцю рэк, таму на ёй было пабудавана 235 чыгуначных мастоў. Сфатаграфаваны на нашых здымках мост адносіцца да іх ліку і знаходзіўся хутчэй за ўсё непадалёку ад Брэста. Здымак зроблены ў 1915 годзе да часу акупацыі гэтых мясцін германскай арміяй. Унікальным з'яўляецца здымак ваеннага шпіталя, які размяшчаўся ў Дзісне падчас вайны. Аб бязлітасным характары вынікаў вайны сведчыць французская пасляваенная паштоўка з выявай салдацкіх магілак пад Вердэнам. На ёй сапраўднае мора крыжоў. Баі пад крэпасцю Вердэн нездарма назвалі "вердэнская мясарубка", тут з абодвух бакоў за сем месяцаў загінула каля мільёна французскіх і нямецкіх салдат. У экспазіцыі прадстаўлены і здымкі з магілаў нямецкіх і рускіх салдат, краявіды беларускіх гарадоў на нямецкіх паштоўках.

Аб пагаршэнні жыцця народаў падчас вайны і пасля яе апавядаюць расійскія і нямецкія папяровыя грошы, ваенныя займы, карткі на прадукты харчавання і шмат іншага.У калекцыях музея прадстаўлены папяровыя 5 капеек,50 капеек, якія прыйшлі пад час вайны на месца ранейй ва ўжыткумедных і сярэбраных манет. Купюры вартасцю ў 1 рубель,5 рублей 1916 года прастаўлены з аднолькавымі нумарамі і серыямі што сведчыць аб вялікай інфляцыі ў час вайны.Унікальнай знаходкай з'яўляецца пячатка асобай нарады па харчаванню Дзісенскага павета 1916 года. Найбольш цікавымі для наведвальнікаў музея з'яляюцца ваенныя рэліквіі, прадметы рыштунку салдат першай сусветнай вайны.Першай сусветнай вайны: салдацкія біклажкі розных ваюючых краін, вайсковыя спражкі Расіі, Германіі, Аўстра-Венгрыі, узнагароды, жэтоны, гузікі.

Асабліва цікавай была знаходка жэтона з бронзы 1916 года на ўспамін аб Першай сусветнай вайне. На адным баку жэтона – выява імператара Мікалая II, на другім – караля Англіі Георгія V і Прэзідэнта Францыі Пуанкарэ. Акрамя гэтай адзнакі ў фондах музея



Рэпазіторый ВГУ

змешчаны знойдзены непадалёку ад вёскі Шчоўна нагрудны знак добрай захаванасці салдата рускай арміі "За отличную стрельбу". Адзнака выраблена з бронзы ў 1914 годзе. У раздзеле гістарычнага музея "Наш край у гады Першай сусветнай вайны" знаходзіцца таксама і памятны медаль гэтага перыяду з выявамі прэзідэнта Францыі Пуанкарэ на адным баку, а на другім – рускага імператара Мікалая II. Медаль адшуканы быў ля в.Дубашынскі Двор.

Рарытэтам экспазіцыі музея з'яўляецца першы рускі процівагаз 1915 года з надпісам на рускай мове "Ён уратуе тваё жыццё". Цікавым экспанатам з'яўляецца самаробная салдацкая алюмініевая лыжка з надпісам на рускай мове: "В память отечественной войны – 1914–1915–1916 г. г. Т. П. Камарницкий". На адваротным баку лыжкі выбіта, напэўна, дата запісу: 14.11.1916, ініцыялы салдата Т. П. К. Памятку знайшлі ў Клецкім раёне вучні Садоўскай СШ і перадалі настаўніцы Вользе Крыцкай. У тых месцах, якраз непадалёку, пралягала лінія фронту, дзе на працягу амаль трох год ішла пазіцыйная вайна. І ў салдата Камарніцкага быў вольны час, каб зрабіць сабе зручную лыжку і на ўспамін пакінуць пра сябе надпісы.

Напамінам аб Першай сусветнай вайне з'яўляецца падараваны нам паэтам Сяргеем Панізнікам кубак-кварта, зроблены з гільзы. Гэта кварта была падарункам паэту ад бабулі Альжбеты Францаўны Панізьнік, з рук якой упершыню ўбачыў будучы паэт святло жыцця. Кубак быў змайстраваны яе бацькам Фролам Шамёнкам. Магчыма, снарад, які вылецеў з гільзы, прынёс смерць салдату, а з кварты, зробленай з яе, вяскоўцы з вёскі Бабышкі шмат дзесяцігоддзяў наталялі смагу.

Шмат артэфактаў з акопаў Першай сусветнай вайны былі падараваны нам калекцыянерам з Даўгаўпілса Міколам Паўловічам. Гэта пломбы ад скрынак са зброяй з Дынабургскай крэпасці, бутэлькі ад адэкалону, чарнілка, спражкі, падковы ад салдацкіх ботаў, браніраванае шкло, шрапнэль і іншыя артэфакты з нямецкіх акопаў [5, с. 22].

Шмат перыядычных выданняў, якія апавядаюць нам аб вайне таксама змешчаны ў фондах музея. Напрыклад, часопіс "Ніва", № 43 за 1915 год, у якім ім размешчаны дзённік і храналогія вайны на ўсіх франтах, а таксама нумары; шмат плакатаў краін Антанты з заклікам уступаць у шэрагі войскаў для абароны айчыны. У часопісе змешчаны здымкі загінуўшых падчас вайны георгіеўскіх кавалераў. Паміж імі і наш зямляк – паручык П. Барткевіч. Большасць выданняў былі знойдзены на Мёршчыне, іх прывезлі з сабою салдаты, нашы землякі. Напрыклад, "Краткая история Карсского полка", 1912 года, "Нямецкі атлас усходняга і паўднёва-усходняга франтоў 1915", "Карманная карта русско-германского и русско-австрийского фронтов великой войны. Вильно. 1915 г."

Шмат выданняў змешчана на выставе кніг па ваеннай справе, якія прывезлі пасля вайны нашы вайскоўцы, якія вучыліся па іх, калі заканчвалі ваенныя вучылішчы або кароткатэрміновыя курсы. Вось толькі некаторыя іх назвы: "Наставление по стрельбе из трёхлинейной винтовки образца 1891 года", "Вооружение и стрельба пехоты. Ч. 29. Для военных училищ ускоренных выпусков. Составил подполковник К. Капченков. Москва. 1916 г.", В. М. Никифоров "Основы топографии", Петроград, 1917 г. Кніга была надрукавана Петраградскім камітэтам ваенна-тэхнічнай дапамогі аб'яднання навуковых і тэхнічных арганізацый. Цікавае выданне з фондаў музея – "Краткий Русско-турецкий разговорник", 1915 г. – сведчыць аб тым, што нашы землякі ваявалі і на каўказскім фронце, дзе ваявалі турэцкія салдаты. З замежных выданняў мы змясцілі ў экспазіцыі рэдкае выданне на польскай мове Эдварда Лісоцкага "Маршал Фердынанд Фош", надрукаванае ў Варшаве ў 1923 годзе. Менавіта галоўнакамандуючаму кааліцыйнымі сіламі Антанты належыць выключная роля ў перамозе над Германіяй на завяршаючым этапе вайны ў 1918 годзе.

Аб Першай сусветнай вайне можна даведацца і з фундаментальных выданняў другой паловы 20 стагоддзя. Напрыклад, энцыклапедычнае выданне "Первая мировая война", "Вооружённые силы и военное искусство в Первой мировой войне, "Августовские пушки"



Репозиторий ВГУ

і г. д. Наведвальнікі выставы змогуць тут азнаёміцца і з шэдэўрамі мастацкай літаратуры, прысвечанымі Першай сусветнай вайне: Э.Хэмінгуэя, Э. М. Рэмарка, Анры Барбюса, В. Вішнеўскага, Э. Стральцова і інш.

Такім чынам, экспазіцыя і фонды гістарычнага музея СШ №3 змяшчаюць разнастайныя рэчавыя і дакументальныя матэрыялы, якія дазваляюць вучням і навукоўцам праводзіць даследаванні па тэме Першай сусветнай вайны.


1. Ермалёнак, В.А. Землякам наша памяць і пашана / В. А. Ермалёнак // Міёрскія навіны. – 2015. – №4. – С.4.
2. Ермалёнак, В.А. Выстава “100 год вайны 1914–1918 г.г. / В. А. Ермалёнак // Мёрская даўніна. – 2014. – №11. – С.6.
3. Лучыновіч, Я. Успаміны. НДФ гістарычнага музея СШ №3 / Я. Лучыновіч // Фонд 14. – Вопіс 3. – С. 4.
4. Сцепулёнак, Ф. Успаміны. НДФ гістарычнага музея СШ №3 / Ф. Сцепулёнак // Фонд 14. – Вопіс 6. – С.8.
5. Кніга ўлікаў экспанатаў гістарычнага музея. – №5. – С. 1–22.


## ЧЕЛОВЕК ВО «ЧРЕВЕ» ВОЙНЫ (В КОНТЕКСТЕ ВОЕННЫХ ПРОИЗВЕДЕНИЙ М. ГОРЕЦКОГО, А. БАРБЮСА, Э.М. РЕМАРКА, С. СЕРГЕЕВА-ЦЕНСКОГО)


А.В. Русецкий


Четыре года длилось противостояние союзников царской России и сил кайзеровской Германии (1914–1918). Трагически-драматическим прессом, предпринятая в 1914 г. попытка перекроить мир насильственными средствами, прошлась по судьбам миллионов людей. Не оставила мельница войны и белорусскую землю (военные действия вели Западный и Северный фронты) – огромные материальные разрушения, сотни тысяч беженцев, десятки тысяч не вернувшихся в родные места и из изгнания, и с фронтов военный действий.

Жизнь в изгнании … Ее социальные и духовно-нравственные последствия до сих пор остаются мало изученными (можно вспомнить лишь рассказ Я. Коласа «Туда, на запад» и небольшую пьесу М. Горецкого «Шутливый Писаревич», написанные в середине 1920-х годов. В современной прозе выделяется роман Вл. Гниломедова «Россия» (2007)).

Из всего многообразия проблем, рожденных Первой мировой войной (политические и экономические причины четырехлетнего военного противостояния, потери в войне, территория военных действий, отношение к войне различных социальных слоев в Европе и России, последствия войны и т.д.) обратимся к одной, в высшей степени антигуманной – ломке человеческих судеб в горниле войны, оторванности 18–20-ти (да и 40)-летних от реальной действительности, жизненных человеческих стремлений, теме, в которой из множестве произведений русской и европейской литературы, особое место принадлежит трем реалистическим (ибо написаны они непосредственными участниками событий), написанным писателями разных национальностей. (Не оставим в стороне и роман С. Сергеева-Ценского (он не был участником военных действий) «Брусиловский прорыв»). А, значит, и по-разному осмысливающими характер человека на войне, его мысли, его характер, мотивы его действий и поступков. Это классик белорусской литературы Максим Горецкий («На империалистической войне. (Записки солдата 2-й батареи n-ской артиллерийской бригады Леона Задумы»), немецкий писатель Эрих Мария Ремарк («На западном фронте без перемен»), французский писатель о общественный деятель Анри Барбюс («Огонь. Дневник взвода»)*.

*К примеру, А. Барбюс, несмотря на многочисленные решения разных комиссий, добился, чтобы его 40-летнего отправили на фронт, и 23 месяца провел на передовой и только после ранения был комиссован; М. Горецкий в 21 год в июне 1914 г. записался в армию вольноопределяющимся и был демобилизован из армии по «белому билету» лишь в январе 1918 г.




Репозиторий ВГУ